УДК 94(438:476) «1928/1930»

*А.П. Дзмітрук*

# РЭГІЯНАЛЬНЫ ЭТАП ФАРМІРАВАННЯ БЕСПАРТЫЙНАГА БЛОКА МАРШАЛА Ю. ПІЛСУДСКАГА (НА ПРЫКЛАДЗЕ ПАЛЕСКАГА ВАЯВОДСТВА (1928–1930 гг.))

На падставе матэрыялаў Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці адлюстраваны працэс стварэння ўрадавай палітычнай групоўкі супрацоўніцтва з урадам маршала Ю. Пілсудскага на прыкладзе Палескага ваяводства як рэгіянальнай адзінкі. Аналіз генезісу дазволіў аўтару вызначыць яго фазы, акрэсліць сістэму кіравання краем, характар узаемасувязяў паміж яе элементамі.

## Уводзіны

У польскай, савецкай, беларускай гістарыяграфіі існуюць усяго тры манаграфіі, дзе блок выступае ў якасці аб'екта даследавання [1–3]. Праблему генезісу Беспартыйнага блока супрацоўніцтва з урадам маршала Ю. Пілсудскага (далей – ББСУ) падымаў А. Хайноўскі, але на цэнтральным узроўні, не закранаючы рэгіянальны. На яго погляд, рэгіянальны аспект з'яўляецца ключавым пры вызначэнні характару палітычнай групоўкі. Актуальнасць артыкула абумоўлена яшчэ і тым, што ўпершыню разглядаецца функцыянаванне агульнапольскага ББСУ на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Асаблівасцю крыніцазнаўчай базы па пастаўленым пытанні з'яўляецца яе сціпласць. Дакументы, выпрацаваныя самой палітычнай групоўкай, амаль адсутнічаюць. Найбольш масавай крыніцай інфармацыі аб дзейнасці блока з'яўляюцца справаздачы грамадзянскай і ваеннай адміністрацыі. Але, аналізуючы дзейнасць ББСУ з дапамогай такіх крыніц, даследчык павінен улічваць, што аб'ектыўныя дадзеныя ён атрымлівае не толькі і не столькі аб генезісе і дзейнасці палітычнай групоўкі, колькі аб самім суб'екце. З тэорыі крыніцазнаўства вядома, што інфармацыйную аддачу ад дакументаў магчыма павысіць шляхам вылучэння з іх схаванай інфармацыі, бо вядома, што разам з той інфармацыяй, якую суб'ект імкнецца наўмысна атрымаць ці прадставіць, вылучаецца і інфармацыя празмерная, якая зафіксавана міжвольна і таму невідавочная для суб'екта. Акрамя гэтага, на падставе архіўных матэрыялаў Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці ўзнікае магчымасць супастаўлення справаздач ваеннай і грамадзянскай адміністрацыі, што дазваляе таксама верыфіцыраваць крыніцы.

Структурны характар гэтай інфармацыі дазваляе аналізаваць узаемасувязі, уласцівыя разглядаемым з'явам і працэсам, на падставе непасрэдна выражаных у крыніцах дадзеных. Усё гэта абумоўлівае прымяненне ў даследаванні палітычнай групоўкі сістэмнага падыходу як найбольш эфектыўнага метаду.

Падчас выбараў у сейм і сенат 1928 г. Савет міністраў Рэчы Паспалітай Польшчы (назва дзяржавы падаецца згодна з загалоўкам Канстытуцыі і артыкула 1; далей – РП Польшчы – *А.Д.*) выступіў ініцыятарам стварэння ўрадавай групоўкі. Ён прызначаў, кантраляваў працэс стварэння ваяводскіх рэгіянальных камітэтаў на чале з ваяводамі, якія займаліся не толькі фарміраваннем выбарчых камітэтаў Беспартыйнага блока, але і кіравалі ўсёй выбарчай акцыяй згодна з дырэктывамі ўрада, падпарадкоўваючы грамадскія арганізацыі свайму ўплыву. Іх роля ў якасці кіраўніка грамадскім рухам юрыдычна замацавана ў Распараджэнні прэзідэнта РП Польшчы аб арганізацыі і межах дзейнасці ўлад агульнай адміністрацыі. У сваю чаргу, функцыяй ББСУ падчас выбараў на заходнебеларускіх землях стала мабілізацыя польскага насельніцтва, канцэнтрацыя польскіх галасоў. На першым этапе – гэта шыльда для дзейнасці адміністрацыі [4]. У выніку выбарчай акцыі ББСУ атрымаў 130 мандатаў з 444 у сейме і 46 з 111 у сенаце.

У канцы сакавіка 1928 г., адразу пасля выбараў, лідары пілсудчыкаў абвясцілі свой намер захаваць ББСУ, па-першае, як адзіны клуб паслоў і сенатараў і стварылі ў сувязі з гэтым арганізацыйны камітэт № 1 і яго прэзідыум на чале з В. Славекам. Па-другое, было абвешчана, што ён будзе дзейнічаць у якасці ваяводскіх груп і на тэрыторыях, дзе да супрацоўніцтва заклікалі «мужоў даверу» і кандыдатаў спіса № 1, якія не прайшлі ў сваіх акругах [1, с. 69].

У красавіку 1928 г. ва ўсіх ваяводствах адбыліся арганізацыйныя з’езды з удзелам паслоў, сенатараў, прадстаўнікоў цэнтральных улад ББСУ (В. Славек) і прадстаўнікоў мясцовай адміністрацыі. Апошнія былі пачынальнікамі пасяджэнняў: зачытвалі рэфераты, уводзілі сваіх прадстаўнікоў, прапаноўваючы, нават навязваючы тым самым накірункі працы ББСУ. Як вынік – стварэнне пастаянных ваяводскіх бюро ББСУ. Такім чынам, парламенцкі клуб арганізацыі выкарыстоўваўся ўладамі як база для стварэння сеткі на месцах.

Калі суаднесці дадзеныя адміністрацыйных улад, то заўважым, што працэс стварэння рэгіянальных структур блока ў 1928 г. у Палескім ваяводстве таксама супадае па часе з выбарамі, але ўжо на мясцовым узроўні. З красавіка 1928 г. была абвешчана выбарчая акцыя ў гарадскія рады павятовых гарадоў. У маі 1928 г. у сувязі з гэтым былі створаны выбарчыя камітэты розных партый, у тым ліку Камітэт беспартыйнага блока працы самакіравання. Цікавасць выклікае факт, што непасрэдна напярэдадні выбараў у гарадскую раду Брэста, якія адбыліся ў сярэдзіне чэрвеня, быў аформлены ваяводскі сакратарыят у Брэсце (1 чэрвеня 1928 г.). Акрамя гэтага, у выніку выбараў у гарадскія рады павятовых гарадоў, па-першае, было пашырана ў іх хрысціянскае прадстаўніцтва; па-другое, адначасова ствараліся арганізацыйныя структуры ББСУ [5, с. 2, 15, 21, 32].

Найбольш важнымі акцыямі восенню 1928 г. былі ўстаноўчы з’езд Арганізацыі сярэдняга стана на ўсходніх землях, практычным вынікам якога стала не толькі стварэнне арганізацыі, але і выбарчага камітэта для правядзення выбараў у Рамесную палату [6, с. 50; 7, с. 80, 102], гмінныя выбары і раскол у ППС, які адбыўся на цэнтральным узроўні, але закрануў і мясцовыя пляцоўкі.

На працягу верасня–лістапада 1928 г. паэтапна праводзяцца гмінныя выбары. Напрыклад, у Драгічынскім павеце выбарчы каляндар паказвае дакладную прадуманасць акцыі: 7 верасня выбіралі гмінных радных у Драгічыне, 8 – у Моталі і Бездзежы, 10 – Хомску, 11 – Янаве, 13 – Асоцах. Адзначаецца, што ў іх склад увайшло 20% палякаў [6, с. 135; 7, с. 65]. Адначасова напярэдадні саміх выбараў у кастрычніку 1928 г. ваяводскі сакратарыят арганізаваў павятовыя сакратарыяты [7, с. 47].

У лістападзе–снежні 1928 г. аднавіла сваю дзейнасць Польскае таварыства «Белы крыж», таксама быў створаны ў Брэсце Саюз грамадзянскай працы жанчын. Да майскага перавароту пілсудчыкі праяўлялі цікавасць да стварэння базы лагера праз легальныя грамадскія арганізацыі, а пачынаючы з 1926 г. працэс набыў планавы, сістэмны характар. Прычым займацца гэтай справай пачалі ваяводы, старасты. «Сетка кааператываў, кас Стэфчука, гандлёвых, малочных таварystваў пакрыла Палескае і Навагрудскае ваяводствы. Паўсюдна пры выдатнай дапамозе адміністрацыйных улад» [8]. Фінансаванне большасці з іх вялося ваяводскай радай, пэўнымі міністэрствамі праз цэнтральныя органы арганізацыі.

Аднак калі назіраць за справаздачамі, то можна заўважыць, што кіраўніцтва ДАК IX адзначала: напрыканцы 1928 г. ББСУ з кожным днём усё больш страчваў кантакт з выбаршчыкамі і адхіляўся ад ходу грамадскага жыцця, назіраўся масавы пераход служачых у апазіцыйныя партыі [8, с. 10]. Ваенныя ўлады характарызавалі рэгіянальныя гурты як «род бюракратычных устаноў» [8, с. 10]. Фактычна са сканчэннем серыі выбараў ББСУ не змог развіць ніякай іншай дзейнасці на дадзеных тэрыторыях. А ў пачатку 1929 г. ББСУ страціў свой ўплыў і ў Палескім, і ў Навагрудскім ваяводст-

вах [9]. Кіраўнік ДАК IX адзначаў: «Нягледзячы на тое, што колькасна прадстаўляецца грунтоўна, ўсё ж гэта фікцыя» [10; 11, с. 133–134].

З сакавіка па май 1929 г. ББСУ імкнуўся павысіць свой прэстыж праз правядзенне рэгіянальных з'ездаў і завязванне кантактаў з польскім грамадствам [12]. Праходзіла рэарганізацыя выбарчых камітэтаў ББСУ ў гарадскія ці павятовыя рады. На Палессі яна праходзіла ў перыяд з 9 лютага па 6 сакавіка 1929 г. [13, с. 46; 14, с. 22–30]. Найбольш значнай падзеяй стаў з'езд функцыянераў Блока, на які 10 мая 1929 г. у Брэсце над Бугам сабраліся прадстаўнікі павятовых рад Палескага ваяводства і пасольскага Палескага клуба ББСУ, кіраўніцтва блока – В. Славек і М. Даланоўскі (генеральны сакратар) [14, с. 32]. На з'ездзе былі ўсталяваны прынцыпы супрацоўніцтва мясцовых арганізацый блока з дзяржаўнай адміністрацыяй. На заўвагу старшыні Пружанскай павятовай рады Т. Свіды, што кіраўніцтва ББСУ, не ведаючы мясцовых умоў, дабівалася правядзення ў жыццё невыканальных на гэтай тэрыторыі распараджэнняў, В. Славек адказаў, што ніводная нерэальная прапанова не будзе здзейснена, бо існуе ваявода, які лепш ведае патрэбы Палесся [13, с. 91; 14, с. 35; 15, с. 31–32]. Такім чынам, на мясцовым узроўні замацавалася залежнасць ваяводскай арганізацыі ББСУ не толькі ад кіраўніцтва клуба, але і ад ваяводы.

Амаль адразу пасля з'езда (23 мая 1929 г.) з ваяводскага сакратарыята ББСУ ў адрас кіраўніка аддзела бяспекі Палескай ваяводскай установы С. Траяноўскага было адпраўлена два паведамленні. У адным з іх на падставе інфармацыі, атрыманай ад павятовых сакратарыятаў, адзначалася, што жыццё рамесных цэхаў часткова замірае. Рамеснікі не ахоплены ніякімі ўплывамі, часткова знаходзяцца пад апекай іншых апазіцыйных арганізацый. Гэтую сітуацыю трэба было змяніць. У сувязі з тым, што сродкаў на правядзенне акцыі ББСУ не меў, ён звярнуўся да кіраўніка аддзела бяспекі з просьбай аказання дапамогі. «Формай яе магло б быць указанне падпарадкаваным ваяводскай установе прамысловым рэферэнтам ініцыяваць акцыю ажыўлення цэхаў і пракантраляваць выкананне гэтага даручэння». З боку ваяводскага сакратара такое ж распараджэнне выдадзена і павятовым сакратарам ББСУ [16, с. 105].

У другім пісьме ваяводскі сакратар А. Ханебах просіць Палескую ваяводскую ўстанову даследаваць умовы стварэння кампраміснага спіса, які б суадносіўся з вынікамі перамоў урада з цэнтральнымі ўладамі рамесных арганізацый. На яго погляд, правядзенне гэтай акцыі было б больш эфектыўным праз скліканне ўладамі канферэнцыі прадстаўнікоў рамеснікаў-хрысціян і яўрэяў з усіх паветаў. Ініцыятыва з боку ваяводскага сакратарыята ББСУ можа такому кампрамісу прынесці шкоду [16].

Справа ў тым, што яшчэ ў пачатку мая пры прыняцці бюджэту гарадской рады старшыня праўлення ББСУ доктар Лопат выступіў супраць скарачэння яўрэйскіх субсідый, што прывяло да яго змяшчэння. Яго супернік – ваяводскі сакратар А. Ханебах – выкарыстаў саму справу як прапагандысцкую акцыю, мэтай якой была не толькі кансалідацыя палякаў, але і ўцягванне ўсіх хрысціян-рамеснікаў у час выбараў у палату. Але пасля такога тыпу акцыі выступіць з ініцыятывай кампраміснага яўрэйска-хрысціянскага спіса кіраўніцтва Палескай ББСУ не магло і прапанавала, каб гэтую працу ўзяла на сябе ваяводская ўстанова. А само пачало развіваць дзейнасць сярод хрысціянскіх рамеснікаў, выступаючы ў якасці ініцыятара і цэнтра іх аб'яднання, імкнулася любымі сродкамі кансалідаваць хрысціянскую меншасць і такім чынам стварыць хрысціянскае прадстаўніцтва ў Рамеснай палаце. У выніку з ідэяй стварэння сумеснага хрысціянска-яўрэйскага спіса выступіла адміністрацыя, якая праводзіла выбарчую кампанію ў палату з дапамогай брэсцкага аддзялення Арганізацыі сярэдняга стана на ўсходніх землях на чале з С. Жуком [17, с. 6].

Актыўнае супраціўленне яўрэйскага насельніцтва выклікала не толькі скарачэнне субсідый, але і само «варшаўскае» пагадненне (11 палякаў і 7 яўрэяў), якое прапа-

ноўвалі ўлады падчас выбараў у Рамесную палату. Толькі 10 лістапада 1929 г. адміністрацыя змагла склікаць у Брэсце з'езд прадстаўнікоў хрысціян-рамеснікаў і яўрэяў, які прывёў да згоды кіраўнікоў цэха і Саюза яўрэйскіх рамеснікаў у Польшчы з польскімі арганізацыямі. У выніку паразумення выстаўлены сумесны спіс ва ўсіх чатырох выбарчых акругах. Выбары ў Рамесную палату ў Брэсце над Бугам адбыліся 26 студзеня 1930 г. і фактычна поўнасцю згодна з мэтамі адміністрацыі. Роля ББСУ ў дадзенай акцыі зводзілася ў асноўным да правядзення антыяўрэйскай прапаганды, з дапамогай якой імкнуліся правесці кансалідацыю галасоў польскіх рамеснікаў і ўцягвання ў яе астатніх хрысціян [18, с. 1].

Акрамя выбараў ў Рамесную палату дзейнасць урада ішла і ў іншых накірунках: працэсе ўніфікацыі сельскагаспадарчых арганізацый, спробах наладзіць працу ў рабочых асяродках праз ППС (былую рэвалюцыйную фракцыю) [13, с. 184, 261].

Аднак мясцовыя сакратарыяты, акрамя іншых недахопаў, па ацэнцы ваенных улад, мелі адзін кардынальны: не маглі вылучыць з грамадства ідэйны элемент, які б здольны быў праводзіць працу сярод грамадства, настаўляць яго ў накірунку ідэалогіі Ю. Пілсудскага. Барацьба за ўплыў і амбіцыі прывялі да сітуацыі, што замест таго каб сцэментаваць усё, што сканцэнтравалася пад сцягам маршала Ю. Пілсудскага, пачалі расці ўзаемны антаганізм, нянавісць. Такое становішча, на думку ўлад, патрабавала неадкладнай санацыі, бо ў іншым выпадку ўзаемная варожасць можа прывесці да таго, што людзі (нават з найлепшымі намерамі) будуць уцягнуты ў вір барацьбы [19, с. 11–13].

Акрамя гэтага, у справаздачы адзначалася, што ББСУ ўплываў толькі на служачых і частку асаднікаў, астатняя частка грамадства засталася па-за дзейнасцю ББСУ [19, с. 11–13]. Такія высновы дэманструюць незадаволенасць польскіх улад вынікамі стварэння ўрадавага руху на рэгіянальным узроўні ў гэты перыяд.

Фактычна дзейнасць адміністрацыі паказвае, што галоўнай мэтай стала стварэнне тэрытарыяльнай структуры Блока, яго базы ў выглядзе грамадскіх арганізацый, асабліва на павятовым і гмінным узроўнях, г.зн. акцыя, ініцыіраваная ўрадам, прасоўвалася ўглыб. Яна суправаджалася правядзеннем выбараў у тэрытарыяльнае і прафесійнае самакіраванне, паміж якімі назіралася цесная сувязь, прычым гэты працэс насіў планавы характар. На дадзеным этапе выразна відна роля адміністрацыі, якая з дапамогай рэгіянальных пасольскіх груп выступіла ў якасці ініцыятара і каардынатара працэсу фарміравання як ББСУ, так і грамадскіх арганізацый. Таксама назіраліся спробы выкарыстання створаных структур для працы з некаторымі слаямі насельніцтва, і адначасова пры гэтым ішло выпрабаванне іх сіл, магчымасцей, сілы ўздзеяння на масы. Характар супрацоўніцтва ББСУ і адміністрацыі на дадзеным этапе найбольш ярка праявіўся найперш падчас з'езда, дзе была ўстаноўлена залежнасць ББСУ як ад кіраўніцтва клуба, так і ад ваяводы, а таксама ў перадвыбарчы перыяд у Рамесную палату г. Брэста над Бугам. У апошнім выпадку адбылося размежаванне функцый паміж ББСУ і адміністрацыяй, якое найбольш эфектыўна забяспечвала вынікі акцыі.

У пачатку 1930 г. цэнтральныя ўлады праводзілі рэвізію фактычнага стану ББСУ на тэрыторыях. У сакавіку 1930 г. кожны ваявода і староста падаў справаздачу аб дзейнасці Блока; сваю ацэнку давала паліцыя, дзеячы партый, якія ўвайшлі ў склад ББСУ, а з красавіка генеральны сакратар ББСУ дасылаў у рэгіёны сваіх эмісараў, якія даследавалі сітуацыю ў некаторых ваяводствах [1, с. 158].

Арганізацыйна структура Блока ў Палескім ваяводстве не была канчаткова сфармавана. Ваяводскае праўленне да 1 сакавіка 1930 г. так і не было аформлена. Яно ажыццяўлялася калегіумам, у склад якога ўвайшлі старшыня і сакратары павятовых рад, але фактычна бяздзейнічала [20, с. 65, 93]. Рэальна існавалі толькі ваяводскі сакратарыят (дзе былі платныя пасады) і рэгіянальная пасольская група, але наладзіць супрацоўніцтва паміж сабой гэтыя дзве структуры ў рэгіёне не змаглі.

Акрамя таго аказалася, што павятовыя арганізацыі, хаця і былі створаны, але ніякай дзейнасці не праявілі. Нягледзячы на тое, што старасты ў сваіх справаздачах адзначалі наяўнасць гмінных камітэтаў амаль ва ўсіх вёсках і гарадах, аднак іх асабовы склад не быў зацверджаны вышэйстаячымі ўладамі ББСУ, таму групы не былі канчаткова сфармаваны [20, с. 12]. Ваявода наконт гэтага выказаўся наступным чынам: «Мясцовых гуртоў не арганізавана да гэтага часу. Сувязь з сялянскім насельніцтвам ажыццяўляецца праз давераных асоб» [20, с. 91–92]. У справаздачы вызначаліся прычыны такога стану.

Вайсковае кіраўніцтва ў Брэсце над Бугам у сваіх справаздачах за 1929 г. адзначала, што хаця ББСУ колькасна на тэрыторыі Палескага і Навагрудскага ваяводстваў прадстаўляецца ў справаздачах ваявод нядрэнна, але «гэтыя дадзеныя з’яўляюцца фікцыяй» [9, с. 2]. У сваю чаргу, старасты адзначалі, што ўплыву Блока падлягаюць асобы, якія займаюць кіраўнічыя пасады ў таварыствах, у сувязі з чым саюзы развіваюцца ў накірунку, азначаным Блокам [20, с. 50]. А ваявода ў якасці галоўнага выніку працы ББСУ адзначыў атрыманне пяці мандатаў у сейм (з дзесяці) і ўсіх трох у сенат.

Калі больш пільна назіраць за дзейнасцю кіраўніцтва Блока ў 1930 г. як у цэнтры, так і на перыферыі, то можна вызначыць, што яго актыўнасць была скіравана наўцягванне розных арганізацый у працу Блока і адначасова іх падпарадкаванне. У пачатку 1930 г. генеральны сакратар ББСУ выдаў інструкцыю, паводле якой уводзілася членская сістэма і ўстанаўлялася залежнасць арганізацыйных адзінак Блока, фармулявалася тактыка прыняцця ў Блок новых членаў, ставілася задача ажыўлення дзейнасці [21, с. 21].

Гэта, як і працэс уніфікацыі сельскагаспадарчых гуртоў, выклікала супраціўленне некаторых грамадскіх арганізацый, што засведчылі вальны сход Брэсцкага аддзела Саюза легіянераў (15 студзеня) і з’езд дэлегатаў аддзелаў гэтага саюза з Палеска-Падляскай акругі (19 студзеня). Абодва сходы, акрамя вырашэння арганізацыйных пытанняў, былі прысвечаны і палітычным праблемам. Палескі ваяводскі сакратарыят ББСУ быў абвінавачаны ў неадпаведных метадах працы, якія, на думку дэлегатаў, не садзейнічалі цеснаму супрацоўніцтву з Саюзам. Лідэрам апазіцыі стаў пасол П. Алявінскі, адзін з кіраўнікоў Аб’яднання працы горада і сяла. Яе дзеячы ў красавіку 1930 г. публічна выступілі супраць надання ББСУ на тэрыторыі ўсходнепольскіх ваяводстваў арганізацыйных форм партыі, што, на іх погляд, супярэчыць характару Блока, які з’яўляецца і павінен быць толькі парламенцкім прадстаўніцтвам усіх элементаў, што згуртаваліся на ідэях майскага перавароту [22, с. 270].

Але кіраўніцтва ББСУ падтрымала дзеянні ваяводскага сакратара. З красавіка па чэрвень 1930 г. Блок праводзіў працу па рэарганізацыі, а знешніх акцый так і не праводзіў. У сувязі з пашырэннем Блока у маі назіралася значнае павелічэнне яго членаў з ліку дзяржаўных служачых, настаўнікаў, прадстаўнікоў органаў самакіравання і свабодных прафесій. За гэты час канчаткова склаліся прэзідыумы павятовых рад, і асноўны цяжар працы перамясціўся на гмінныя камітэты, якія ў межах сваіх тэрыторый пачалі вербаваць членаў сялянскіх гуртоў. І зноў жа што паралельна з рэарганізацыяй была абвешчана выбарчая кампанія ў гарадскія і гмінныя рады [18, с. 46; 23, с. 8].

У той жа час у чэрвені 1930 г. непаразуменні ва ўрадавым лагеры, якія ўзніклі ў студзені, яшчэ больш абвастрыліся, але, па ацэнцы ваенных улад, яны не знайшлі сур’ёзнага водгуку ў шырокіх слаёў насельніцтва з-за малалікасці груповак, якія змагаліся за ўладу, і нетрываласці іх сувязі з жыццём насельніцтва Палесся. «Указаныя з’явы заслугоўвалі ўвагу як сімптаматычны эпізод хутчэй тэарэтычнага значэння, чым практычнага» [24, с. 140].

Канец непаразуменням паклаў з’езд прэзідыумаў павятовых рад і вядомых дзеячаў ББСУ ў Брэсце над Бугам 20 ліпеня 1930 г. На ім прысутнічалі былы прем’ер-міністр К. Світальскі, Т. Галуўка, намеснік генеральнага сакратара ББСУ Сядлецкі, сена-

тар Друцка-Любецкі, пасол П. Алявінскі. К. Світальскі адзначыў, што арганізацыйнай асновай Блока павінна стаць салідарнасць сярод членаў і субардынацыя, якая выражаецца словам «загад». Немагчыма невыкананне загада, усе спробы парушэння арганізацыйнай дысцыпліны павінны жорстка карацца. Галоўная задача Блока – падрыхтоўка грамадства да наступных выбараў у заканадаўчыя органы. Другі прамоўца – Т. Галуўка – выказаўся на тэму працы на тэрыторыі крэсаў, мэта якой «упаньствоўванне» («звязванне з дзяржавай») крэсаў і яднанне іх з маці-Польшчай. Ён жа абгрунтаваў патрэбу правядзення прынцыповых змен у Рэчы Паспалітай, без якіх немагчыма рацыянальнае развіццё дзяржавы [7].

У жніўні 1930 г. асноўныя намаганні ўлад былі накіраваны на правядзенне выбараў у органы самакіравання г. Брэста над Бугам, якое было прызначана на 14 верасня. Блок не выступіў самастойна, але стварыў спіс № 16 «Дэмакратычнае хрысціянскае аб'яднанне» і спіс № 17 «Дэмакратычнае хрысціянскае аб'яднанне прадмесцяў». Асобным спісам ішла ППС (былая рэвалюцыйная фракцыя) (спіс № 12) [25, с. 119–122]. Улады не правялі ніводнага мітынгу, не выпусцілі ніводнай лістоўкі ў падтрымку вызначаных спісаў. Але, нягледзячы на гэта, вынік выбараў выявіў, што пераважную большасць галасоў атрымалі хрысціяне, а рашаючы ўплыў у радзе набыў ББСУ [18, с. 85, 96; 26, с. 21]. Усё гэта аказала вялікае ўражанне на жыхароў Брэста над Бугам.

Фактычна выбары ў органы самакіравання сталі лепшым агітацыйным сродкам Блока напярэдадні агульнадзяржаўных выбараў у сейм і сенат і доказам таго, што дае польскаму грамадству падпарадкаванне загадам партыі і адміністрацыі. Аднак калі аналізаваць дзейнасць Блока падчас гэтай фазы рэгіянальнага этапу стварэння праўрадавага руху, то выразна відаць, што яе вынікам у дадзены перыяд сталі не столькі вынікі выбараў, колькі падпарадкаванне польскіх грамадскіх арганізацый уладам ББСУ.

У разгар перадвыбарчых баталій у гарадскую раду Брэста над Бугам 30 жніўня акруговыя выбарчыя камісіі абвясцілі пачатак выбарчай кампаніі ў прадстаўнічыя органы РП Польшчы на падставе выбарчага ўстава ў сейм ад 28 ліпеня 1922 г. Выбары былі прызначаны на 16 лістапада 1930 г. Стварэнне тэрытарыяльных выбарчых камітэтаў у сейм і сенат і звязаны з гэтай падзеяй шэраг арганізацыйных сходаў ББСУ распачаў у перыяд 13–20 верасня 1930 г. [18, с. 82]. Непасрэдна напярэдадні галасавання ў гарадскую раду 13 верасня 1930 г. былі створаны выбарчыя камітэты ў Брэсце і ў Пінску. Ваяводскі выбарчы камітэт ББСУ на тэрыторыі Палескага ваяводства быў сфармаваны 20 верасня дзякуючы Саюзу настаўнікаў народных школ і пасля змякчэння ўнутраных супярэчнасцей паміж Ваяводскім сакратарыятам і прадстаўнікамі Федэрацыі Саюза польскай абароны Айчыны [18, с. 91–92].

Важным аргументам на карысць Блока стала рашэнне Сарненскага аддзялення Саюза землеўласнікаў, якое не пагадзілася з пазіцыяй ваяводскага саюза гэтай арганізацыі адносна выбараў і выказалася за безумоўную падтрымку ББСУ [18, с. 91; 27, с. 29–32]. Але замацаваць поспех і правесці сход землеўласнікаў яны не змаглі. У гэты ж час на з'ездзе Палескай ваяводскай рады 6 кастрычніка асаднікі, за выключэннем прадстаўнікоў ад Пружанскай і Лунінецкай арганізацый, канчаткова вырашылі ісці на выбары з ББСУ [18, с. 114; 25, с. 187].

У наступны перыяд (5–11 кастрычніка 1930 г.) намаганні ББСУ ў накірунку прыцягнення да супрацоўніцтва грамадскіх груп прадоўжылася, але адначасова распачалася арганізацыя выбарчых камітэтаў у паветах і гмінах [18, с. 113]. Цікавай з'явай, якая яскрава праявілася ў дадзеных выбарах, стала стварэнне не толькі тэрытарыяльных выбарчых камітэтаў, але і прафесійных, такіх як Дырэкцыя выбарчага камітэта работнікаў чыгункі, Палескі ваяводскі выбарчы камітэт настаўнікаў народных школ, Саюз работнікаў пошты Віленскай акругі, Рабочы выбарчы камітэт інтэлектуальных работнікаў.

У пачатку кастрычніка былі падрыхтаваны спісы членаў выбарчай камісіі па выбарах у сейм і сенат 1930 г. Нягледзячы на тое, што ў іх прысутнічалі прадстаўнікі праваслаўнага насельніцтва, улады сведчылі, што кандыдаты – усе прыхільнікі ББСУ. Спісы кандыдатаў у паслы і сенатары можна было падаваць да 7 кастрычніка ўключна ў выбарчую камісію. Цывільныя і ваенныя ўлады пільна аналізавалі акруговыя спісы ў цэлым і асобна тыя, якія падаваліся нацыянальнымі меншасцямі [18, с. 358, 125–128].

Пасля вылучэння спіса кандыдатаў Блок распачаў шырокую прапагандысцкую і мітынговую акцыю. Быў складзены графік мітынгаў. У абедзвюх акругах Блок шырока выкарыстоўваў друкаванае слова. Акрамя гэтага, прапаганда вялася і на публічных, і на закрытых сходах, прычым перавага аддавалася апошнім [28, с. 40; 18, с. 138].

Адметнасцю выбарчай кампаніі стала шырокае выкарыстанне грамадскіх арганізацый. Каб акрэсліць іх функцыі, трэба азнаёміцца з распараджэннямі, выдадзенымі іх цэнтральнымі органамі. Важнае месца ў іерархіі грамадскіх арганізацый заняло Таварыства рэзервістаў, якое ўваходзіла ў Федэрацыю польскіх абаронцаў Айчыны. 20 верасня 1930 г. яно выдала сваім падначаленым аддзелам загад, што «абавязкам кожнага члена з'яўляецца галасаванне за спіс Блока, а ў падрыхтоўчы перыяд – актыўны ўдзел у выбарчых камітэтах», а таксама арганізацыйна-вярбовачная дзейнасць і цеснае супрацоўніцтва з выбарчымі камітэтамі ББСУ. Аддзяленні таварыства павінны былі:

1) выбраць членаў, якія ўвойдуць у склад выбарчых камітэтаў у якасці агітатараў, давераных асоб г.д.;

2) арганізаваць службу сувязі (кур'ераў, ганцоў) і забяспечыць яе сродкамі камунікацыі (роварамі, канямі і падводамі, стварыць пункты начлегу);

3) арганізаваць сталыя аддзелы выбарчай стражы, задачай якіх былоназіранне, падтрыманне парадку і арганізацыя «мабільных груп» для выканання сакрэтных распараджэнняў.

Пасля заканчэння выбараў усе аддзелы і службы павінны былі захавацца [29, с. 7–8].

Задачай галоўнага рабочага выбарчага камітэта інтэлектуальных работнікаў сталі мітынговая дзейнасць сумесна з ББСУ і правядзенне сходаў і канферэнцый. Кожны работнік за тры апошнія дні перад галасаваннем у сейм, а потым і ў сенат павінен быў склікаць некалькі сходаў хаця б толькі з некаль-кіх чалавек і прачытаць ім лекцыі [30, с. 2].

Дастаткова актыўна ў выбарах 1930 г. выступіў выбарчы камітэт Дырэкцыі чыгуначнікаў у Вільні, які стварыў мясцовыя камітэты чыгуначнікаў па месцах іх кампактнага пражывання на тэрыторыі Віленскага, Навагрудскага, Палескага і Беластоцкага ваяводстваў і задаваў агульны накірунак іх дзейнасці. Дырэкцыя размеркавала камітэты па малых станцыях з мэтай апекі над работнікамі, якія працавалі ў школах.

У кастрычніку–лістападзе 1930 г. сталі праводзіцца пасяджэнні грамадскіх арганізацый «для ўстанаўлення адзінства поглядаў па пытанні галасавання ў сейм і сенат». На гэтых сходах, як правіла, аднагалосна прымаліся рашэнні не толькі галасаваць за спіс ББСУ, але і схіляць да гэтага іншых грамадзян мястэчак і вёсак [30, с. 14]. Вынікі выбараў у сейм і сенат пацвердзілі прагнозы адміністрацыі: безумоўную перамогу атрымаў ББСУ. На першым пасяджэнні парламенцкага клуба 26 лістапада 1930 г. былі ўхвалены яго асноўныя арганізацыйныя прынцыпы яго дзейнасці.

Падчас гэтай фазы працэсу фармавання Блока ўвесь выбарчы працэс быў падзелены на перыяды, якія адпавядалі асноўным патрабаванням, прадугледжаным законам. Адметнасцю стала стварэнне не толькі тэрытарыяльных выбарчых камітэтаў, але і прафесійных, а таксама шырокі ўддзел у выбарчай кампаніі грамадскіх арганізацый. Іх месца і роля ў Беспартыйным блоку вызначалася функцыямі, якія яны выконвалі пры арганізацыі і правядзенні выбараў, якія завяршыліся ў ваяводстве поўнай перамогай урадавай групоўкі. На дадзеным этапе захоўвалася вядучая роля адміністрацыі, але ажыц-

цяўлялася пераразмеркаванне паўнамоцтваў паміж Блокам і грамадскімі арганізацыямі, у выніку чаго склалася структура руху пілсудчыкаў і канчатковае афармленне ББСУ.

**Заключэнне**

Працэс стварэння ББСУ на рэгіянальным узроўні – пэўны этап на шляху пабудовы ўрадавага руху, частка агульнага плана ўрада. Захоўваецца цесная ўзаемасувязь паміж выбарамі і арганізацыйнай працай урадавага руху, але на іншым іерархічным узроўні. Важную ролю ў стварэнні гэтай палітычнай групоўкі адыграла адміністрацыя (ваяводы і старасты), якая на дадзеным этапе стала самастойным суб'ектам, кіраўніком працэсу, у той час як ББСУ быў аб'ектам яе дзейнасці. Калі ў якасці асноўнага крытэрыю вылучыць дзейнасць самой адміністрацыі, то ў генезісе ББСУ даволі выразна праглядаюцца тры асноўныя фазы: 1) 1928–1929 гг., 2) студзень–жнівень 1930 г., 3) жнівень–лістапад 1930 г.

Галоўнай скрытай мэтай першага этапа стала стварэнне тэрытарыяльнай структуры Блока і яго базы ў выглядзе грамадскіх арганізацый, асабліва на павятовым і гмінным узроўнях. Гэта суправаджалася ўстанаўленнем залежнасці ББСУ як ад кіраўніцтва клуба, так і ад ваяводы, а вынікам стала размежаванне функцый паміж адміністрацыяй і ББСУ, што забяспечывала эфектыўнасць выбарчай кампаніі. Падчас другога этапа замацоўваецца падпарадкаванне польскіх грамадскіх арганізацый уладам ББСУ, што суправаджалася ўнутранымі канфліктамі. Вынікам стала перамога палітычнай групоўкі ББСУ на выбарах у гарадское самакіраванне, што стала лепшым агітацыйным сродкам Блока напярэдадні агульнадзяржаўных выбараў у сейм і сенат і доказам таго, што дае польскаму грамадству падпарадкаванне загадам партыі і адміністрацыі. На трэцім этапе адбылося пераразмеркаванне паўнамоцтваў паміж Блокам і грамадскімі арганізацыямі, якое завяршаецца фармаваннем структуры руху пілсудчыкаў праз ББСУ.

Такім чынам, утварэнне ББСУ сведчыць пра ўмацаванне ўладных паўнамоцтваў польскай адміністрацыі шляхам стварэння цэласнай сістэмы кіравання. Яе элементамі сталі не толькі дзяржаўныя рэгіянальныя ўрадавыя органы, але і Блок, а таксама грамадскія арганізацыі на тэрыторыі Палескага ваяводства, якія выступалі ў якасці прадмета дзейнасці як адміністрацыі, так і дзеячаў ББСУ. Блок стаў своеасаблівай формай узаемадзеяння улад з грамадскімі арганізацыямі, выконваў ролю пасрэдніка паміж імі. Аналіз генезіса гэтай палітычнай групоўкі дае магчымасць вызначыць метады дзейнасці адміністрацыі ў грамадскай сферы, характар узаемаадносін паміж элементамі сістэмы кіравання, ролю і месца кожнага.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Chojnowski, A. Piłsudczycy u władzy. Dzieje BBWR / A. Chojnowski [et al.]. – Wrocław–Warszawa : Ossolineum, 1986. – 294 s.

2. Dziuda, K. Dzieje Bezpartyjnego Bloku Współpracy z Rządem w Łodzi w latach 1930–1935 / K. Dziuda. – Bełchatów : Związek Strzelecki «Strzelec» Organizacja Spoleczno-Wychowawcza, 2010. – 300 s.

3. Скульский, С. Беспартыйный блок сотрудничества с правительством (санация) / С. Скульский. – Минск : Изд-во Белорус. АН, 1935. – 62 с.

4. Дмитрук, Е.П. Формирование ББСП маршала Ю. Пилсудского на западно-белорусских землях, его роль в системе власти / Е.П. Дмитрук // Грані історії : зб. наук. пр. / ГІІМ Донбас. держ. пед. ун-ту ; под ред. В.М. Докашенко. – Горлівка, 2013. – Вип. 6. – С. 177–188.

5. Государственный архив Брестской области (ГАБО). – Фонд 67. – Оп. 1. – Д. 964. Отчёты Полесского воеводы об общественно-политическом движении в воеводстве 1928 г.

6. ГАБО. – Фонд 1. – Оп. 9. – Д. 1246. Сведения о состоянии и деятельности фашистской организации «Беспартийный блок сотрудничества с правительством» за апрель–сентябрь 1930 г.

7. ГАБО. – Фонд 1. – Оп. 9. – Д. 1350. Донесение брестского поветового старосты о съезде поветовых рад фашистской организации «Беспартийный блок» 16–27 июля 1930 г.

8. ГАБО. – Фонд 67. – Оп. 1. – Д. 932. Отчёты ДОК IX об общественно-политическом движении на территории корпуса за 4 квартал 1928 г.

9. ГАБО. – Фонд 67. – Оп. 1. – Д. 1212. Отчёты ДОК IX об общественно-политическом движении на территории корпуса за 2 квартал 1929 г.

10. ГАБО. – Фонд 67. – Оп. 1. – Д. 1213. Отчёты ДОК IX об общественно-политическом движении на территории корпуса за 3 квартал 1929 г.

11. ГАБО. – Фонд 67. – Оп. 1. – Д. 946. Отчёты Белостокского, Новогрудского, Люблинского и Полесского воевод об общественно-политическом движении в воеводствах 29 апреля 1928 г. – 30 января 1932 г.

12. ГАБО. – Фонд 67. – Оп. 1. – Д. 1211. Отчёт ДОК IX об общественно-политическом движении на территории корпуса за 1 квартал 1929 г.

13. ГАБО. – Фонд 1. – Оп. 9. – Д. 448. Недельные отчёты брестского поветового старосты об общественно-политической ситуации в повете за декабрь 1928 – декабрь 1929 гг.

14. ГАБО. – Фонд 1. – Оп. 9. – Д. 740. Отчёты и донесения поветовых старост о проведении митингов членами фашистской организации «Беспартийный блок сотрудничества с правительством» за 1929 г.

15. ГАБО. – Фонд 67. – Оп. 1. – Д. 1253. Отчёты Полесского воеводы об общественно-политическом движении в воеводстве за апрель–август 1929 г.

16. ГАБО. – Фонд 1. – Оп. 9. – Д. 2475. Отчёты Полесского воеводы о состоянии и деятельности фашистской организации ББСУ в воеводстве.

17. ГАБО. – Фонд 67. – Оп. 1. – Д. 1672 Донесения тайных агентов о деятельности организации ББСП и ее членов. 25 апреля – 3 июля 1930 г.

18. ГАБО. – Фонд 67. – Оп. 1. – Д. 1574. Отчёты Полесского воеводы об общественно-политическом движении в воеводстве. – 1930 г.

19. ГАБО. – Фонд 1. – Оп. 9. – Д. 1214. Отчёты поветовых старост Полесского воеводства о состоянии и деятельности фашистской организации ББСУ 23 февраля – 8 марта 1930 г.

20. ГАБО. – Фонд 67. – Оп. 1. – Д. 1214. Отчёты ДОК IX об общественно-политическом движении на территории корпуса за 4 квартал 1929 г.

21. ГАБО. – Фонд 1. – Оп. 9. – Д. 1016. Квартальные отчёты Командования окружного корпуса № 9 об общественно-политической ситуации на территории корпуса за 1930 г.

22. ГАБО. – Фонд 1. – Оп. 9. – Д. 1246. Сведения о состоянии и деятельности фашистской организации «Беспартийный блок сотрудничества с правительством» за апрель–сентябрь 1930 г.

23. ГАБО. – Фонд 67. – Оп. 1. – Д. 1532. Отчёт ДОК IX об общественно-политическом движении на территории корпуса за 2 квартал 1930 г.

24. ГАБО. – Фонд 67. – Оп. 1. – Д. 1252. Отчёты Полесского воеводы об общественно-политическом движении в воеводстве 1930 г.

25. ГАБО. – Фонд 1. – Оп. 9. – Д. 1059. Месячные и недельные отчёты брестского поветового старосты об общественно-политической ситуации в повете за период с 1 июля по 8 октября 1930 г.

26. ГАБО. – Фонд 93. – Оп. 1. – Д. 1244. Информационные сообщения и рапорты полицейских об участии в выборах в городскую раду профессиональных польских организаций за август 1930 – сентябрь 1930 г.

27. ГАБО. – Фонд 1. – Оп. 8. – Д. 479. Решения и протоколы заседаний общественных организаций о подготовке к выборам в сейм и сенат 17 сентября – 9 октября 1930 г.

28. ГАБО. – Фонд 93. – Оп. 1. – Д. 1245. Информационные сообщения, донесения полицейских о предвыборной кампании по выборам в Сейм на территории Брестского повета за 28 октября – 14 ноября 1930 г.

29. Государственный архив Могилевской области. – Фонд 32. – Оп. 1. – Д. 7. Приказы и инструкции по работе 1930–1932 г.

30. ГАБО. – Фонд 493. – Оп. 5. – Д. 2. Циркуляры главного Варшавского подготовительного комитета, протоколы собраний Полесского воеводского и Пинского поветового подготовительных комитетов по выборам в Сейм и Сенат. 25 октября – 18 ноября 1930 г.

***Dzmitruk A.P.*** **Regional Stage of Formation Nonpartisan Block Cooperation with the Government of Marshal J. Pilsudski (on the example of Polesski Province (1928–1930)**

On the basis of archival material of the State Archives of Brest Region reflects the process of creating a political group of Nonpartisan block cooperation with the government of Marshal J. Pilsudski is shown on the example of Polesski province as a regional entity. The analysis allowed the author to determine the genesis of its phases, to define the control system, the nature of the relationship between its elements.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 17.07.2013